12. О дополнении к постановлению о передаче Белоруссии районов с преобладающим белорусским населением: Декрет ВЦИК, 24 марта 1924 г. // Собрание узаконений и распоряжений рабочего и крестьянского правительства РСФСР. – 1924. – № 39. – Ст. 357.

13. Бараноўскі, А. Пазіцыя губернскіх улад адносна змянення адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прыналежнасці Віцебскай губерні ў 1919–1924 гадах / А. Бараноўскі // Беларуская думка. – 2019. – № 7. – С. 57–63.

## КУЛЬТУРНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ З САВЕТАМ ЕЎРОПЫ

***Дз.А. Крывашэй (Мінск)***

Адным з напрамкаў міжнароднага супрацоўніцтва Рэспублікі беларусь з’яўляецца ўдзел у міжнародных арганізацыях. Адной з іх з’яўляецца Савет Еўропы. Пачынаючы з 16 верасня 1992 г. Рэспубліка Беларусь мела статус «спецыяльна запрошанай» дзяржавы ў рамках дзейнасці Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ), а 12 сакавіка 1993 г. падала заяўку на ўступленне Савет Еўропы.

У кастрычніку 1993 г. Беларусь далучылася да Еўрапейскай культурнай канвенцыі, што дазволіла атрымаць доступ да праграм еўрапейскага супрацоўніцтва ў галіне культуры, адукацыі, спорту, СМІ і інш. [6, с. 48] А ў 1996 г. наша краіна стала ўдзельніцай Еўрапейскай Канвенцыі па ахове археалагічнай спадчыны [1].

Пачатак супрацоўніцтва з Саветам Еўропы вызначаўся значнай актыўнасцю. У першую чаргу спецыялісты з Беларусі атрымалі магчымасць азнаёміцца з вопытам сваіх еўрапейскіх калег шляхам стажыровак, кансультацый, удзелу ў міжнародных семінараў, канферэнцыях і г.д. За няпоўныя 5 гадоў (верасень 1992 г. – снежань 1996 г.) гэтай магчымасцю скарысталася больш за 300 прадстаўнікоў разнастайных галін улады Беларусі (сярод іх і прадстаўнікі ўстаноў культуры) [5, с. 167–168].

Пры падтрымцы Савета Еўропы быў праведзены шэраг мерапрыемстваў у Бларусі. Найбольшую цікаўнасць выклікаў міжнародны семінар-прадстаўленне праграмы «Культурныя шляхі праз Беларусь» з удзелам кіраўніка праграмы Савета Еўропы Д. Ранконі (верасень 1995 г., г. Полацк), арганізаваны Міністэрствам культуры і друку Рэспублікі Беларусь, Саветам культурных ініцыятыў і Полацкім гарвыканкамам [5, с. 168].

У наступныя гады адбылося згортванне палітычных кантактаў. У студзені 1997 г. Бюро ПАСЕ прыняло рашэнне аб прыпыненні статусу «спецыяльна запрошанага» ў адносінах да парламента Беларусі. У выніку быў таксама спынены разгляд заяўкі Рэспублікі Беларусь на ўступленне ў Савет Еўропы і замарожана двухбаковая праграма супрацоўніцтва. У такой сітуацыі ўзаемадзеянне з Саветам Еўропы працягвала развівацца ў рамках

Рэпазіторый ВДУ

шэрагу канвенцый, да якіх далучылася наша краіна. У першую чаргу – Еўрапейскай культурнай канвенцыі.

З Саветам Еўропы ў справе ўдасканалення заканадаўчай базы Беларусі ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны плённа супрацоўнічаў Камітэт па ахове гісторыка-культурнай спадчыны (існаваў да 2001 г., у 1993–1998 гг. – Дзяржаўная інспекцыя Рэспублікі Беларусь па ахове гісторыка-культурнай спадчыны). Створаная ў 1997 г. пры Камітэце па культурнай спадчыне Савета Еўропы група заканадаўчай падтрымкі прааналізавала Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны». У 1998 г. яна падрыхтавала заключэнне па праекту Палажэння аб парадку перамяшчэння культурных каштоўнасцей праз мытную мяжу Рэспублікі Беларусь [7, л. 17].

У 1999 г. пад старшынствам міністра культуры быў створаны Кіруючы камітэт па супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Саветам Еўропы ў галіне культурнай спадчыны. Было прынята рашэнне далучыцца да праектаў «Асноўныя рэлігійныя месцы», «Еўрапейская асацыяцыя гістарычных гарадоў», «Панарама еўрапейскай музычнай спадчыны», «Кіно і еўрапейская спадчына», «Сталіцы, што чакаюць свайго адкрыцця» [8, л. 194–195].

Па запрашэнні кіраўніцтва Дэпартамента культуры і культурнай спадчыны Савета Еўропы прадстаўнікі Міністэрства культуры ў 2002 г. удзельнічалі ў цырымоніі адкрыцця Еўрапейскіх дзён спадчыны ў г. Боне і г. Эсэне (Германія), у сустрэчы груп каардынатараў Еўрапейскіх дзён спадчыны ў г. Страсбургу (Францыя) [2, с. 35].

Вынікам удзелу Беларусі ў праграме Савета Еўропы «Культурныя шляхі» стала далучэнне ў 2004 г. да сертыфікаванага культурнага маршруту «Еўрапейскі шлях яўрэйскай спадчыны», а ў 2005 г. – да самага доўгага маршрута VIA REGIA («Каралеўскі шлях») [12].

У 2007 г. у рамках праекта «Вызначэнне культурных актораў зменаў у Беларусі, Украіне і Малдове», які фінансаваўся Еўрапейскім культурным фондам і Нямецкім офісам Фонда Маршала (ЗША), палітолагам Яэль Оана была падрыхтавана справаздача «Культура і змены ў Беларусі» [13].

У 2009 г. пасля працяглага перапынку аднавіліся мерапрыемствы ў рамках праграмы Савета Еўропы «Беларусь самабытная. Традыцыі. Мова. Рамествы».

У 2010 і 2011 гг. прадстаўнікі нашай краіны ўдзельнічалі ў пленарных пасяджэннях Кіруючага камітэта па культуры і Кіруючага камітэта па пытаннях культурнай спадчыны і ландшафту. 14–16 мая 2012 г. Беларусь прыняла ўдзел у першым пасяджэнні новага Кіруючага камітэта па культуры, спадчыне і ландшафту [10, p. 13]. У тым жа годзе было падпісана пагадненне паміж Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Саветам Еўропы па ўключэнні профілю краіны ў Кампендыум культурнай палітыкі [14, p. 15]. Яно прадугледжвала падрыхтоўку нацыянальнага даклада па

Репозиторий ВГУ

культурнай палітыцы і яго наступны аналіз еўрапейскімі экспертамі. Аднак па розным прычынам пагадненне не было рэалізавана.

Падзеяй стала выданне ў 2013 г. на беларускай мове «Белай кнігі па міжкультурнаму дыялогу» – галоўнага дакумента, які вызначае стратэгію дзяржавы ў сферы культуры і культурнай спадчыны. Яна была зацверджана міністрамі замежных спраў краін-членаў Савета Еўропы на 118-й сесіі Камітэта міністраў у Страсбургу ў маі 2008 г. Беларуская мова стала 25-й мовай свету, на якую перакладзены дакумент.

Па словах тагачаснага міністра культуры Беларусі Барыса Святлова, гэта падзея азначае далучэнне рэспублікі да еўрапейскіх каштоўнасцей і прынцыпаў, якія з'яўляюцца асновай для стабільнага існавання і развіцця грамадства [3].

З 2015 па 2017 г. Рэспубліка Беларусь ўдзельнічала ў праекце COMUS (Урбаністычныя стратэгіі гістарычных гарадоў, арыентаваныя на супольнасці), які ініцыявалі Еўрапейскі Саюз і Савет Еўропы ў рамках Праграмы па развіцці культуры Ўсходняга партнёрства. Дзейнасць па праекце ажыццяўлялася ў партнёрстве з Арганізацыяй гарадоў Сусветнай спадчыны ў Арменіі, Беларусі, Грузіі, Рэспубліцы Малдова і Украіне. Ад Беларусі ў праекце ўдзельнічаў г. Мсціслаў.

1 сакавіка 2020 г. Беларусь на адзін год атрымала статус назіральніка ў Пашыраным частковым пагадненні аб культурных маршрутах Савета Еўропы, заключаным у 2010 г.

Савет Еўропы прапанаваў Беларусі далучыцца да Рамачнай канвенцыі аб каштоўнасцях культурнай спадчыны для грамадства (Канвенцыя Фару) і Канвенцыі аб правапарушэннях, якія тычацца культурных каштоўнасцей. Пасля падпісання Канвенцыі Фару Беларусь атрымае магчымасць удзельнічаць ў Плане дзеянняў Фару. Горад Мсціслаў, які прымаў удзел у праеце COMUS, можа стаць членам супольнасці Фару і падзяліцца сваім вопытам з іншымі гарадамі краіны [11, р. 25].

Неабходна адзначыць, што малая колькасць рэалізаваных культурных праектаў тлумачыцца, сярод іншага, тым фактам, што культура не з'яўлялася прыярытэтным напрамкам супрацоўніцтва Савета Еўропы з Беларуссю.

У той жа час больш актыўны ўдзел нашай краіны ў разнастайных праектах гэтай арганізацыі дазволіў бы атрымаць не толькі кансультатыўную, але і тэхнічную дапамогу па розным напрамкам культурнай дзейнасці, у першую чаргу, у сферы захавання культурнай спадчыны, садзейнічаў бы папулярызацыі шматнацыянальнай самабытнай культуры Беларусі ў Еўропе, прыцягненню ў нашу краіну турыстаў.

Вялікі патэнцыял супрацоўніцтва з саветам Еўропы бачыцца ў сферы кінавытворчасці. Удзел нашай краіны ў фондзе падтрымкі кіно Eurimages мог бы садзейнічаць разнастайнай падтрымцы кінавытворчасці, наступнай



Репозиторий ВГУ

папулярызацыі і дыстрыбуцыі беларускага кіно ў Еўропе. На думку спецыялістаў, далучэнне да Еўрапейскай канвенцыі аб сумеснай кінавытворчасці дазволіла б прыцягнуць еўрапейскія кампаніі да здымкаў фільмаў у нашай краіне, гарантавала абарону аўтарскіх правоў і атрыманне даходаў ад выкарыстання кінапрадукцыі [9].

*Крыніцы і літаратура:*


1. Аб падпісанні Еўрапейскай канвенцыі па ахове археалагічнай спадчыны : Указ Прэзідэнта Рэсп. Беларусь, 7 жн. 1996 г., № 286 // Збор указаў Прэзідэнта і пастаноў Кабінета Міністраў Рэсп. Беларусь. – 1996. – № 22. – Арт. 542.
2. Беларуская культура сёння. Гадавы агляд (2001) / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ін-т праблем культуры; рэд. У.П. Скараходаў. – Мінск : БелДІПК, 2002. – 72 с.
3. Беларусь афіцыйна далучылася да культурнай палітыкі Еўропы [Электронны рэсурс] // БелТА. – 28.06.2013. – Рэжым доступа: https://m.blr.belta.by/culture/view/belarus-afitsyjna-daluchylasja-da-kulturnaj-palityki-europy-16671-2013.
4. Беларусь получила статус наблюдателя в Расширенном частичном соглашении о культурных маршрутах Совета Европы [Электронный ресурс] // Режим доступа: https://coe.bsu.by/index.php/ru/33-news-ru/309-01-03-2020ru. – Дата доступа: 14.04.2020.
5. Дрозд, Н. Совет Европы и Беларусь: проблемы и перспективы / Н. Дрозд // Беларуская думка. –1996. – № 10. – С. 167–176.
6. Крывашэй, Д.А. Міжнароднае супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны / Д.А. Крывашэй // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва : Інфарм.-аналіт. зб. / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 2000. – Вып. 4. – С. 37–49.
7. О проведении Министерством культуры Республики Беларусь внешнеполитической пропаганды посредством международных культурных связей (1997–1998 гг.) : информация М-ва культуры Респ. Беларусь для Администрации Президента Респ. Беларусь, 8 мая 1998 г. // НАРБ. – Ф. 974. Оп. 4. Д. 410. Л. 15–36.
8. Пратакол пасяджэння Кіруючага камітэта па супрацоўніцтву паміж Рэспублікай Беларусь і Саветам Еўропы ў галіне культурнай спадчыны, 14 ліп. 1999 г., № 1 // НАРБ. – Ф. 974. Воп. 4. Спр. 293. Л. 193–197.
9. Супрунюк, А. Кино в погоне за инвестициями [Электронный ресурс] / А. Супрунюк // Белорусы и рынок. – 21.11.2019. – Режим доступа: http://www.belmarket.by/kino-v-pogone-za-investiciyami. – Дата доступа: 15.04.2020.
10. Council of Europe activities for Belarus in 2012–2013 [Electronic resource] / prepared by the Council of Europe Secretariat // Council of Europe. – Mode of access: https://rm.coe.int/16802ed089. – Date of access: 04.12.2019.
11. Council of Europe. Action Plan for Belarus. 2019–2021 [Electronic resource] / prepared by the Council of Europe Secretariat // Council of Europe. – Mode of access: https://rm.coe.int/ap-belarus-2019-2021-web-en/168098f1bd. – Date of access: 04.04.2020.
12. Cultural Routes of the Council of Europe with network members in the Country / Belarus [Electronic resource] // Council of Europe. – Mode of access: https://www.coe.int/en/web/cultural-routes/belarus. – Date of access: 14.04.2020.
13. Ohana, Yl. Culture and Change in Belarus / Y. Ohana; East European Reflection Grop. – Bratislava : European Cultural Foundation, 2007. – 28 p.
14. Report on Council of Europe activities for Belarus in 2012–2013 [Electronic resource] / prepared by the Office of the Directorate General of Progr. // Council of Europe. – Mode of access: https://rm.coe.int/16802ed0b3. – Date of access: 04.12.2019.




Репозиторий ВГУ